*Волосы:* ….
*Прическа:* ….
*Лоб:* …
*Глаза:* ….
*Взгляд:* ….
*Нос:* ….
*Губы:* ….
*Улыбка:* ….

**Задание 11.**

Образуйте прилагательные от числительного *три* и существительных *символ, кратность, знак, единство, лето, год, век, неделя, метр, час, этап*.

**Задание 12.**

Напишите эссе на тему «Без прилагательных жизнь скучна». Требования к эссе: объем текста — страница А4 печатного текста, шрифт Times New Roman 14, интервал одиночный. В тексте эссе постарайтесь как можно больше использовать прилагательные.

Таким образом, предложенные задания позволяют усвоить учебную тему «Имя прилагательное как часть речи» и сформировать грамотную устную речь учащихся. Сформированная устная речь является залогом грамотности и эффективной коммуникации между людьми, а также развитой функциональной грамотности.

**Список литературы**

1. PISA-2018 в Республике Беларусь. Читательская грамотность / А.В. Позняк; под науч. ред. Г.С. Ковалевой. Минск: Медисонт, 2021. — 68 с.
2. Имя прилагательное как часть речи / ЯКласс [Электронный ресурс]. — Режим доступа: https://www.yaklass.ru/p/russky-yazik/10-klass/razdel-morfologii-samostoiatelnye-chasti-rechi-10908/imia-prilagatelnoe-10920/re-5de6a337-bf91-4583-9ba2-ee9d88818e5f. — Дата доступа: 24.03.2024.
3. Исса, С. Из одних прилагательных / Стихи.ру [Электронный ресурс]. — Режим доступа: https://stihi.ru/2017/07/18/3289. — Дата доступа: 24.03.2024.
4. Разряды имен прилагательных / Онлайн-школа Skysmart [Электронный ресурс]. — Режим доступа: https://skysmart.ru/articles/russian/stepeni-sravneniya-imen-prilagatelnyh. — Дата доступа: 24.03.2024.
5. Степени сравнения имен прилагательных / Онлайн-школа Skysmart [Электронный ресурс]. — Режим доступа: https://skysmart.ru/articles/russian/stepeni-sravneniya-imen-prilagatelnyh. — Дата доступа: 25.03.2024.

*Дата поступления в редакцию: 14.06.2024*

# РАЗВІЦЦЁ ФУНКЦЫЯНАЛЬНАЙ АДУКАВАНАСЦІ ВУЧНЯЎ ПРАЗ НАВУЧАННЕ СЭНСАВАМУ ЧЫТАННЮ

*Паўсцяная Вольга Леанідаўна*

***Анатацыя.*** *Раскрыццё здольнасцей кожнага вучня, выхаванне высокадухоўнай і развітай асобы з'яўляецца прыярытэтным напрамкам сучаснай школы. Задача выхавання функцыянальна адукаванага выпускніка патрабуе пошуку эфектыўнага метадычнага інструментарыю. Аўтар прапануе для рашэння згаданых задач такія адукацыйныя інструменты, як метад ”Сюжэтная табліца“, РАФТ-тэхналогія, адаптаваныя да ўрокаў беларускай літаратуры.*

Прыярытэтным напрамкам сучаснай школы з'яўляецца раскрыццё здольнасцей кожнага вучня, выхаванне высокадухоўнай, патрыятычнай і развітай асобы. Важнымі якасцямі выпускніка ўстановы агульнай сярэдняй адукацыі становяцца ініцыятыўнасць, здольнасць творча мысліць і знаходзіць нестандартныя рашэнні, уменне ставіць і дасягаць сур'ёзныя мэты, вучыцца на працягу жыцця [1]. Таму мэтай адукацыі XXI стагоддзя з'яўляецца выхаванне функцыянальна адукаванага выпускніка.

Тэрмін *функцыянальная адукаванасць* быў прапанаваны ЮНЕСКА ў 1957 годзе. У той час функцыянальная адукаванасць складалася з неабходных у паўсядзённым жыцці ўменняў чытаць і пісаць. Сёння функцыянальную адукаванасць разглядаюць як здольнасць чалавека наладжваць зносіны з навакollем, максімальна хутка адаптавацца і функцыянаваць у ім. Гэта паняцце дапоўнілася новымі кампанентамі, адным з іх з'яўляецца чытацкая адукаванасць. Чытацкая адукаванасць — здольнасць чалавека разумець і выкарыстоўваць пісьмовыя тэксты, меркаваць пра іх і займацца чытаннем для таго, каб дасягнуць сваіх мэт, пашыраць свае веды і магчымасці, удзельнічаць у сацыяльным жыцці [4].

Пра існаванне функцыянальнай адукаванасці мы даведваемся, толькі сутыкнуўшыся з яе адсутнасцю. Таму прапаную паразважаць не столькі пра функцыянальную адукаванасць, колькі пра функцыянальную бязграматнасць, што з'яўляецца адным з вызначальных фактараў, якія замаруджваюць развіццё зносін. Праблема функцыянальнай адукаванасці разглядаецца звычайна не як навуковая і сэнсавая праблема, а як праблема дзейнасная, як праблема пошуку механізмаў і спосабаў паскоранай ліквідацыі непісьменнасці.

У чым розніца паміж паняццямі *чытанне* і *функцыянальнае чытанне*? *Чытанне* — гэта тэхналогія інтэлектуальнага развіцця, спосаб набыцця культуры, пасрэднік у зносінах, сродак для рашэння жыццёвых праблем. Без чытання немагчымае інтэлектуальнае развіццё і самаадукацыя напрацягу жыцця. *Функцыянальнае чытанне* — гэта чытанне з мэтай пошуку ін-

фармацыі для рашэння пэўнай задачы ці выканання канкрэтнага задання. Функцыянальнае чытанне адбываецца праз прыёмы праглядальнае чытання (скаміраванне) і аналітычнага чытання (выдзяленне ключавых слоў, падбору цытат, складання схем, графікаў, табліц). Вучань са сфарміраванымі навыкамі функцыянальнага чытання можа свабодна артымліваць інфармацыю з тэксту — разумець, сціскаць і (ці) пераўтвараць яго змест і інш.

Выдзяляюць тры групы чытацкіх уменняў:

— *арыентацыя ў змесце* тэксту (уменне вызначаць галоўную тэму, агульную мэту ці прызначэнне тэксту; выбіраць з тэксту ці прыдумваць загаловак; фармуляваць тэзіс для выражэння агульнага сэнсу тэксту; тлумачыць парадак частак у тэксце; знаходзіць у тэксце патрэбную інфармацыю і інш.);

— *пераўтварэнне і інтэрпрэтацыя тэксту* (уменне пераўтвараць тэкст, карыстаючыся новымі формамі прадстаўлення інфармацыі: формуламі, графікамі, дыяграмамі, табліцамі; параўноўваць і супастаўляць заключаную ў тэксце інфармацыю рознага характару; знаходзіць у тэксце доказы для пацвярджэння вылучаных тэзісаў і інш.);

— *ацэнка інфармацыі* (водгук на змест тэксту; ацэнка сцверджанняў, зробленых у тэксце, абапіраючыся на свае ўяўленні пра свет; доказы ў абарону свайго пункту гледжання і інш.).

Авалоданне гэтымі ўменнямі і азначае «сэнсавае чытанне», якое з'яўляецца фундаментам для дасягнення адукацыйных вынікаў, вызначаных у адукацыйным стандарце.

У адпаведнасці з патрабаваннямі да зместу вучэбных праграм і плануемых вынікаў яго засваення паказальнікам стануць сфарміраваныя метапрадметныя (універсальныя) вучэбныя кампетэнцыі вучняў. Чытанне і работа з інфармацыяй займае асобае месца сярод метапрадметных уменняў, таму паспяховае навучанне ў школе і паспяховая сацыялізацыя ў дарослым жыцці немагчымыя без сфарміраванай чытацкай адукаванасці.

Метадычны інструментарый настаўніка павінен утрымліваць кампетэнтнасныя заданні, заданні на павышэнне ўзроўню чытацкай адукаванасці праз чытанне аўтэнтычных тэкстаў з выбарачным разуменнем значымай/патрэбнай/цікавай інфармацыі. Адукацыйная задача ў такім выпадку будзе заключацца ў тым, каб фарміраваць у вучняў уменне сэнсавага чытання тэкстаў розных стыляў і жанраў, уменне свядома ўзнаўляць самастойна складзены тэкст, уменне складаць тэксты ў вуснай і пісьмовай форме з улікам магчымасцей вучняў. Такі падыход дазволіць ствараць умовы для дэманстрацыі кампетэнцый вучняў у пэўным сітуацыйным кантэксце, што пацвярджае выключна практыка-арыентаваны характар навучання.

Сутнасць выкарыстання прыёма "Сюжэтная табліца" заключаецца ў тым, што, чытаючы тэкст, вучань робіць у ёй запісы, ствараючы мадэль тэксту энцыклапедычнага артыкула ці мастацкага твора. Эфектыўнасць прыёма пацвердзім вывадамі з аналізу дзейнасці настаўніка і вучня адпаведна. З пазіцыі настаўніка сюжэтная табліца дазволіць:

— *праверыць і ацаніць прадметныя вынікі вучня*: веданне зместу твора, яго тэмы і ідэі, кампазіцыі, сістэмы вобразаў і інш.; параўноўваць і супастаўляць творы, факты з біяграфіі пісьменнікаў, партрэты герояў і інш.; рабіць абагульненні і вывады па тэматыцы вучэных заняткаў;

— *прааналізаваць узровень сфарміраваннасці метапрадметных і асобасных вынікаў*: ствараць водгук на прапанаванае выказванне, твор і інш.; пацвярджаць або абвяргаць пэўную інфармацыю цытатамі з тэксту або фактамі з асабістага жыцця; весці дыялогі, уступаць у дыскусію, самастойна ці ў групе арганізоўваць працу і інш.;

— *забяспечыць дыферэнцыраваны падыход*: веды пра аўтара, змест твора, галоўных і другарадных герояў, ход падзей і інш. (можна ацаніць, *напрыклад*, па дзесяцібальнай шкале ад 3 да 7 балаў);

— *стварыць праблемную ці пошукавую сітуацыю* для стымулявання вучняў да актыўнага працэсу навучання.

З пазіцыі вучня прыём сюжэтнай табліцы бачыцца як сродак апрацоўкі вялікага аб'ёму інфармацыі, спосаб развіцця аналітычнага мыслення і памяці, як спроба атрымаць аднаку ці скарэкціраваць сваю вучэбную дзейнасць на занятках і інш. (табліца 1).

| Хто? | Што? | Калі? | Дзе? | Чаму? |
|---|---|---|---|---|
| | | | | |

Табліца 1. – Сюжэтная табліца

РАФТ-тэхналогія — гэта педагагічны метад, накіраваны на стварэнне пісьмовых тэкстаў пэўнай тэматыкі (табліца 2). Мяркуецца, што вучань рознабакова азнаёміцца з тэмай, створыць уласны пісьмовы тэкст. Метад садзейнічае фарміраванню сістэмы меркаванняў, уменню аналізаваць прадметы, змест, праблемы, фармуляваць свае асабістыя вывады, даваць ацэнку [2; 3].

| Роля | Аўдыторыя | Форма | Тэма |
|---|---|---|---|
| Для вызначэння ролі трэба высветліць, хто можа раскрыць зададзеную тэму. | Высвятленне таго, каму можа прапаноўвацца дадзены тэкст. | Выбар жанру, формы паведамлення. | Выбар тэматыкі, вызначэнне тэмы і асноўных ідэй, расрытых у ім. |

Табліца 2. — Тэхналагічная карта для настаўніка

Для выкарыстання РАФТ-тэхналогіі настаўнік вызначаецца з тэмай. Яна павінна быць цікавай і актуальнай. Пры правядзенні ўрока неабходны глыбокія веды па тэме, фантазія і акцёрскае майстэрства. Перад заняткамі рыхтуецца табліца (раздрукаваныя аркушы, выява якіх выводзіцца на экран манітора, ці адзін агульны варыянт, прадстаўлены на дошцы). Падчас абмеркавання дзейнасці на ўроку настаўнік фіксуе адказы вучняў у графы табліцы, бо да пачатковых меркаванняў зварот будзе ісці на працягу 45 хвілін заняткаў, каб іх аналізаваць, дапаўняць, ацэньваць. Пажадана візуалізаваць вучэбны матэрыял.

РАФТ-тэхналогія рэалізуецца праз тры стадыі.

*Стадыя выкліку.* Задача — актывізаваць вучэбна-

пазнавальную дзейнасць вучняў, матываваць іх да актыўнага навучання. Рэкамендавана выкарыстоўваць метады асацыяцый ці мазгавога штурму. Запаўняецца табліца.

”Роля“ — групавую работу (4–6 груп) арганізуе настаўнік па загадзя вылучаных ролях (не больш за 4-5) ці разам з вучнямі.

”Аўдыторыя“ — таксама можа прадставіць настаўнік ці вызначыць разам з вучнямі.

”Форма“ — жанры выніковых тэкстаў. Пажадана, каб жанры вучнёўскіх работ суадносіліся з сацыяльнымі ролямі і мяркуемымі чытачамі.

”Тэкст“ — асноўныя думкі і ідэі тэксту.

Настаўнік зачытвае атрыманую ”інструкцыю“, тлумачачы вучням неабходнасць ”пагружэння“ ў свой аб’ект (пісьменнік, паэт, лірычны герой, персанаж), важнасць спробы адчуць аб’ект, які прадстаўляецца, стаць такім, як аб’ект, зразумець яго і тыя ўмовы, у якіх аб’ект дзейнічае.

*Стадыя канструявання.* Работа выконваецца індывідуальна або ў групе. Пасля выканання задання, зачытваецца некалькі тэкстаў. Выбар робіцца па жаданні або жарэбі.

*Стадыя асэнсавання* прадугледжвае працу з вучэбным дапаможнікам ці дадатковым матэрыялам. На гэтай стадыі вучні атрымліваюць новую інфармацыю, робяць пісьмовыя заўвагі. Прыём ”ЦіРаЛе“ (паскладовая абрэвіяцыя аб’ядноўвае назвы асноўных дзеянняў — *цікава*, у чым праблема; давайце знойдзем усе магчымыя *рашэнні*; вылучым *лепшыя* рашэнні) дапамагае больш якасна правесці асэнсаванне новай інфармацыі.

Прывядзем прыклад выкарыстання РАФТ-тэхналогіі на ўроку літаратуры ў VII класе па тэме ”Янка Купала. ”Курган“. Вобразы гусляра і князя“ (другі ўрок).

1. Настаўнік аб’яўляе тэму ўрока і тлумачыць асаблівасці яго правядзення. Для большага ”пагружэння“ ў тэму пажадана выкарыстаць візуальны рад (слайды, фотаздымкі, малюнкі, ілюстрацыі) з выявай характэрных прымет сялян, князёў, іх побыту, занятку, адпачынку.

Клас дзеліцца на групы, кожная з якіх выбірае адну ролю з прапанаваных настаўнікам — Князь, Гусляр, Сяляне, Пісьменнік, Госці князя. Важна сканцэнтраваць увагу вучняў на неабходнасці пераўтварэння ў персанаж, пошуку такога спосабу ўздзеяння на публіку, які раскрые асаблівасці его характару, звычак, мовы, умоў асяроддзя. Далей вучні вызначаюцца з аўдыторыяй, з тымі, каму будзе адрасавана паведамленне, напрыклад, сялянам, князю, магнатам, пісьменніку, равеснікам і інш.

Наступны этап — выбар жанру аповеду: загад, ліст, апавяданне, нататка, успаміны, дзённік і інш. Усе варыянты зафіксаваны ў табліцы, у кожнага вучня — у сваім сшытку. Перад вызначэннем тэматыкі паведамленняў пажадана ўстанавіць рысы і прыметы кожнай ролі, падзяліцца парадамі і меркаваннямі.

Для працы з дадатковым матэрыялам можна ўзяць вытрымкі са старажытных грамадскіх актаў, цытаты з аповесці У. Караткевіча ”Дзікае паляванне караля Стаха“ (апісанне шляхты, балю, палаца і інш.).

2. Настаўнік паўтарае тэму ўрока і прапануе вучням зачытаць свае тэксты. Для замацавання матэрыялу можна арганізаваць сціслае франтальнае апытванне.

Вынікам урока павінна стаць абмеркаванне і аналіз выкананага задання, выдзяленне асноўных момантаў паведамленняў. Карысна звярнуць увагу на розніцу ў выкладзе адных і тых жа фактаў рознымі ролевымі групамі.

Метад РАФТ садзейнічае больш поўнаму асэнсаванню прадметнага зместу матэрыялу з пазіцыі вучня праз яго самарэалізацыю, творчасць, імправізацыю, аналіз дзеянняў, маральна-этычную ацэнку падзей і асоб.

Матэрыял для складання заданняў па праверцы функцыянальнай адукаванасці можна браць з жыцця: пошук інфармацыі пра работу і заняткі; запаўненне электронных анкет, апытальнікаў, анкет рэгістрацыі; пошук білетаў на ўсе віды транспарту; адпачынак і забавы; пошук інфармацыі пра фільмы, кнігі, музыку і інш.; выбар тавараў і паслуг у сеціве; экскурсіі.

Навучанне сэнсаваму чытанню дае магчымасць эфектыўна арганізаваць вучэбную дзейнасць, вырашаць новыя задачы адукацыі і дасягнуць запланаваных метапрадметных і асобасных вынікаў. Вучань рэалізуе свае запыты і магчымасці, вучыцца дзейнічаць самастойна, крэатыўна мысліць і арыентуецца ў сучасным свеце, што і вызначаецца такім мэтавым арыенцірам сучаснай аддукацыі, як функцыянальная адукаванасць.

### Спіс літаратуры


1. Адукацыйны стандарт сярэдняй адукацыі, зацв. Пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь 26.12.2018 №125. — С. 35–37.
2. Землянская, Е. Стратегия РАФТ для развития критического мышления на уроках гуманитарного направления / Е. Землянская [Электронный ресурс]. — Режим доступа: https://roskonkursy.ru/stati/strategiya-raft-dlyarazvitiya-kriticheskogo-myishleniya-na-urokax-gumanitarnogo-napravleniya.html. — Дата доступа: 03.10.2023.
3. Лебедева, К.С. RAFT-технология как средство формирования образовательной самостоятельности студентов / К.С. Лебедева [Электронный ресурс]. — Режим доступа: https://cyberleninka.ru/article/n/raft-tehnologiya-kak-sredstvo-formirovaniya-obrazovatelnoy-samostoyatelnosti-studentov. — Дата доступа: 03.10.2023.
4. Развіццё чытацкіх уменняў вучняў на ІІ ступені агульнай сярэдняй адукацыі : матэрыялы па выніках работы абласной творчай групы настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры / склад. Р.П. Ільіна ; ДУА «Мін. абл. ін-т развіцця адукацыі». — Мінск : Мін. абл. ін-т развіцця адукацыі, 2018. — С. 9.


*Дата поступления в редакцию: 08.07.2024*